Што такое адзінства

Мельнічук Дзяніс; дзяржаўная установа адукацыі
“Сярэдняя школа №20 г. Брэста
імя Героя Савецкага Саюза Д.М. Карбышава”, 8 “Б” клас

«На своем тысячелетнем пути к самоопределению белорусский народ достойно преодолел многократные попытки лишить его исторической перспективы, культурной и духовной самобытности. Дата 17 сентября 1939 года – символ исторического оформления белорусской нации и искреннего стремления белорусов, разделенных поневоле, жить одной семьей в собственном доме».

А.Р. Лукашэнка

Кожны дзень, прачынаючыся зранку і выходзячы на вуліцу, я гляджу на вялікі дуб, што расце побач з маім домам. Я ведаю амаль кожную галінку гэтага дрэва, ведаю колеры лісця ў кожную пару года, бачу, як ён расце, мужае, змяняецца. Таму што гэта ўсё адбываецца разам з маім сталеннем, разам з маімі зменамі. І гэты дуб стаў ужо часткай майго жыцця. Часткай мяне, часткай маёй краіны. Маёй Беларусі. Я пачынаю атаясамліваць сябе з маім дрэвам, што каранямі настолькі глыбока і трывала стаіць на зямлі. Я пачынаю разумець, што і карані маёй сям’і настолькі ж глыбока ўраслі ў зямлю Бацькаўшчыны. У момант успрыняцця сябе адным цэлым з дрэвам, што расце побач з домам, з блакітным небам, што дае ваду майму дубу, паветрам, птушкай, што знайшла прытулак у кроне магутнага дрэва, разумееш непарыўнае АДЗІНСТВА ўсяго таго, што вакол цябе.

А што такое адзінства? Згадваеш адразу сінонімы: еднасць, агульнасць, супольнасць, суцэльнасць, непадзельнасць. Так, непадзельнасць. Мой край ад Брэста да Полацка, людзі, якія жывуць ў Магілеве і Ваўкавыску, славутасці Гомеля і Браслава – гэта непадзельная мая Радзіма. Ды толькі так было не заўсёды. Пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора Заходняя Беларусь была далучана да Польшчы. Гэта гістарычны факт, пра які я ведаў з урокаў гісторыі, літаратуры, калі чыталі “Урокі пані Мар’і” Янкі Брыля, з інфармацыйных гадзін, дзе класны кіраўнік распавядаў нам інфармацыю пра падзеі мінулага стагоддзя. Але асабліва моцна адчуў боль тых гадоў упершыню, калі паглядзеў фільм “На другім беразе”. Галоўны герой Павел апынуўся на мяжы падзеленай краіны. І назірае, як польская ўлада імкнецца знішчыць беларускі народ, забіраючы мову, культуру, традыцыі. І вось што мяне кранула найбольш – гэта як змянілася пазіцыя хлопца. Спачатку юнак быў абыякавы да падзей, маўляў, мая хата з краю. Але сустрэча з савецкай разведчыцай Лесяй карэнным чынам мяняе яго жыццё. Прыходзіць разуменне важных каштоўнасцяў. Такіх, як сям’я і Радзіма па абодва бакі ракі. Падзеі фільма разгортваюцца ў 1925 годзе і да аб’яднання краіны гістарычна павінна прайсці яшчэ чатырнаццаць гадоў. Але пасля прагляду фільма не засталося

ніякіх сумненняў у тым, што людзі не проста чакалі нейкіх палітычных умоў, а змагаліся і даказвалі ўсім, што адзіны народ раздзяляць мяжой немагчыма.

У чэрвені 2021 года загадам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка было ўстаноўлена Дзяржаўнае свята, самае маладое ў нашай краіне – Дзень народнага адзінства. 17 верасня 1939 года – “дзень, які стаў актам справядлівасці ў адносінах да беларускага народа”, – сказаў Аляксандр Рыгоравіч.

Слова АДЗІНСТВА непарыўна звязана з такімі паняццямі, як любоў, каханне, сям’я. Гэта не проста слова, а пачуццё, якое нараджаецца ў чалавека яшчэ ў дзяцінстве. Калі бацькі вучаць сваё дзіця роднай мове, калі пачынаеш хадзіць па знаёмых вуліцах і заўважаць розныя дробязі: вось пасадзілі маладзенькае дрэва, а вось тут на доме цагліна колерам адрозніваецца, а тут упершыню я ўзяў рукзак аднакласніцы, каб дапамагчы данесці… і такіх момантаў з кожным днём становіцца ўсё больш, але, што цікава, яны не знікаюць у памяці, а назапашваюцца і захоўваюцца назаўсёды. Вось сутнасць еднасці і суцэльнасці: бясконцы працэс любові да свайго дома, вуліцы, людзей - да сваёй Радзімы.

Адзінства – гэта наша каштоўнасць, якую кожны беларус павінен берагчы і ахоўваць, пачынаючы з маленства. Згуртаванасць сям’і, класа, групы ва ўніверсітэце, працоўнага калектыву. Гэта ўсё адзінкі цэлага народа, што ўсяму свету гучна заяўляе пра сваю непахіснасць, трывалась, унікальнасць і самадастатковасць.

Мы, беларусы – мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям’і.